# Гульня – падарожжа “Скарбы роднага краю”

**Мэты:** пашырыць веды вучняў аб вуснай народнай творчасці беларусаў; развіваць вуснае маўленне вучняў, узбагачаць слоўнікавы запас; выхоўваць павагу да беларускага народа і любоў да роднай мовы.

## Ход мерапрыемства

21 лютага у нашай краіне адзначаецца Дзень роднай мовы. А якая мова з’яўляецца для нас роднай? А чаму менавіта беларускаямова з’яўляецца для нас роднай? Мы з вамі жывём у Беларусі. Беларусь – наша Радзіма. Тут мы вучымся, тут будзем працаваць. Тут жывуць нашы мамы і таты, дзядулі і бабулі. Кожны чалавек павінен ведаць сваю мову, не саромецца размаўляць на роднаймове, умець спяваць народныя песні, танчыць народныя танцы.
Сёння наш занятак прысвечаны беларускай вуснай народнай творчасці. Яна ўзнікла тады, калі не было пісьменнасці. Людзі не ўмелі чытаць, пісаць, але ведалі шмат песень, казак, пацешак, загадак, прыказак.
**Казкі.** У даўнія часы, калі простыя людзі расказвалі адзін аднаму, сваім дзецям цікавыя казкі. Героямі казак былі жывёлы, людзі, а таксама выдуманыя істоты. Сюжэты казак былі не толькі забаўляльнымі, але і многаму маглі навучыць.
А цічыталі вы беларускія народныя казкі? Назавіце іх.
***Гульня “З якой казкі”***
1. Думала Ліса на цэлы дзень паесці, але нават і пакаштаваць ежы не прышлося.(Лісіца і Журавель)

2. Касіў на лузе касец. Змарыўся і сеў пад кустом адпачыць.(Лёгкі хлеб)
3. Прынесла курачка сена карове. Карова з’ела сена і дала масла. (Як курачка пеўніка ратавала)
4. Вось пайшоў раз кот у лес на паляванне і заблудзіўся. Шукаў- шукаў дарогу дадому – не знайшоў. Сеў пад ялінкай і плача.(Як кот звяроў напалохаў)
5. “ Схітрыў ці не схітрыў, - адказаў вол, - а стог сена за пагодай накасіў. Ды і шкура ад вашых воўчых зубоў цэлая засталася” (Хітры вол)
6. Шкада стала коціку пеўніка. Ён, як мага ў пагоню пагнаўся. Лісіцу дагнаў, за валасы надраў, пеўніка адабраў. (Кто, певень і лісіца)

**Гульні**

***Конкурс “Алеська”***. А гульня “Алеська” дапаможа нам выявіць самых руплівы і хуткіх.
УМОВЫ ГУЛЬНІ: У цэнтры круга стаіць два стулы, а на іх ляжаць фартухі? Усе дзеці становяцца ў шарэнгу за вядучым. У гуляючых рукі на поясе. Удзельнікі ідуць па кругу з такімі словамі: “Ты, Алеська, не зявай, не зявай, не зявай! Фартух хутка надзявай, надзявай, надзявай!” Як толькі вядучы скажа: “Алеська!”,- гуляючыя павінны падбегчы да месца, дзе ляжаць фартухі, адзець. Удзельнікаў 5, а фартухоў – 4.

**Загадкі**

Загадкі – адзін з самых старажытных жанраў вуснай паэтычнай творчасці народа. Яны даносяць да нас асаблівасці светаўспрымання нашыхпродкаў, якія стваралі загадкі не проста для забавы. Адухаўляючы прыроду, старажытны чалавек і ў загадках пакланяўся небу, сонцу, зорам, агню, дрэвам. Гэта азначае, што першыя загадкі прысвячаліся менавіта з’явам прыроды, якая мела ўладу над чалавекам. Загадкі развіваюць назіральнасць і разважлівасць, здагадлівасць і кемлівасць,трэніруюць памяць.

**«Адгадай»**

Што за астры — люба глянуць.
Толькі ў ночыцвітуць,
А ўдзень — вянуць. (Зоркі.)

Спачаткупадае,
Патом устае,
Паслягасцінігыраздае. (Дождж.)

І ў сто гадоў я малады
Маёнасенне — жалуды. (Дуб.)

За ўсіхптушакёнчарней,
Чысціць поле ад чарвей. (Грак.)

Сосны лечыцьён з вясны,
Доктарамзавуцьлясным. (Дзяцел.)

Адна ў лесе з белай карой,
Паю вас сокам веснавой парой. (Бяроза.)

У залатыклубочаксхаваўсядубочак. (Жолуд.)

Не брэша, не кусае, а ў хатку не пускае. (Замок.)

Рук не мае, а varотыадчыняе. (Вецер.)

Белы, ды нецукар, ног няма, а ідзе. (Снег.)

**«Загадкі-пытанні»**

За правільныадказ — 1 бал.
Чаго на свеце багацей няма? *(Зямлі.)*
Што ляціць без крылаў? *(Вецер.)*
Што хутчэй за ўсё на свеце? *(Думка.)*
Што гаворыць на ўсіх мовах? *(Язык.)*
Што без слёз плача? *(Скрыпка.)*
Што без вады плавае? *(Воблака.)*
Пад які куст заяц садзіцца, калі дождж ідзе?*(Пад мокры.)*
Ці можа страус назваць сябе птушкай?*(Не, богаварыць не ўмее.)*
Дзе гарады без людзей, а рэкі без вады?*(На глобусе, карце.)*
Дзе мароз улетку водзіцца?*(У халадзільніку.)*
Чаго не абнясеш вакол хаты?*(Вады ў рэшаце.)*
На чым знаку не наложыш?*(На агні* і *вадзе.)*

***Гульня “Казачны кошык”.*** Мы з вамі згуляем у гульню, якая называецца “Казачны кошык”.

УМОВЫ ГУЛЬНІ: Усе гуляючыя становяцца ў круг. Гучыць музыка і кошык перадаецца з рук у рукі. Калі музыка змаўкае, то той, хто застаўся з кошыкам у руках выбывае з гульні. Гульня прадаўжаецца да тых пор, пакуль не застанецца адзін гуляючы. Ён і лічыцца пераможцам гэтай гульні.

**Прыказкі і прымаўкі**

Народныя прыказкі і прымаўкі гэта частка духоўнай спадчыны, якая дасталася нам ад нашых прадзедаў. Гэта сапраўды залатая скарбніца народнай мудрасці назапашаная на працягу многіх стагодзяў.

***“Даскажы”***

Век жыві, век… (вучыся).
Усюды добра, а дома… (лепей).
Лёгка зламаць — дыцяжка… (зрабіць).
У восень плача, хтоўвесну… (скача).
Малая пчала, ды і тая… (працуе).
За родны край галаву… (аддай).

**Падвядзенне вынікаў.**

- Аб чым даведаліся? Што найбольш спадабалася?
- Як вы адносіцеся да роднай мовы, да нашай спадчыны?

Чым бы вы хацелі заняцца на прыканцы нашага занятка?: 1. Зрабіць малюнак да народнай казкі (на выбар казка); 2. Скласці самастойна загадку; 3. Падабраць прыказкі на тэму “Праца і лайдацтва”.

У завяршэнні – выстава работ.